ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
29.07.2025 № 135

# Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Геаграфія» для VI–IX класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Геаграфія» (далей – вучэбная праграма) прызначана для вывучэння гэтага вучэбнага прадмета ў VI–IX класах устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Вучэбная праграма разлічана на 191 гадзіну:

для VI класа – на 35 гадзін (1 гадзіна ў тыдзень), з іх на абагульняючае паўтарэнне – 2 гадзіны;

для VII класа – на 35 гадзін (1 гадзіна ў тыдзень), з іх на абагульняючае паўтарэнне – 2 гадзіны;

для VIII класа – на 70 гадзін (2 гадзіны ў тыдзень), з іх на абагульняючае паўтарэнне – 4 гадзіны, 1 гадзіна рэзервовая;

для IX класа – на 51 гадзіну (1,5 гадзіны ў тыдзень: 2 гадзіны ў тыдзень у першым паўгоддзі, 1 гадзіна ў другім паўгоддзі навучальнага года), 1 гадзіна рэзервовая.

3. Мэта навучання вучэбнаму прадмету «Геаграфія» на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі – фарміраванне ў вучняў геаграфічнай культуры і сістэмы ведаў аб прыродных і сацыяльна-эканамічных працэсах у свеце, асобных рэгіёнах, краінах, Рэспубліцы Беларусь.

4. Задачы навучання вучэбнаму прадмету «Геаграфія»:

фарміраванне ў вучняў ведаў аб геаграфічнай абалонцы Зямлі, тэрытарыяльнай арганізацыі эканамічнага жыцця грамадства, узаемадзеянні паміж чалавечым грамадствам і прыродным асяроддзем;

фарміраванне ўменняў характарызаваць фізіка-геаграфічныя асаблівасці прыроды мацерыкоў і акіянаў, вылучаць агульныя і адметныя тэрытарыяльныя асаблівасці, эканоміка-геаграфічныя паказчыкі асобных краін, асаблівасці геаграфічнага і геапалітычнага становішча тэрыторый, стратэгіі ўстойлівага развіцця чалавецтва і Рэспублікі Беларусь;

развіццё ў вучняў здольнасцей бачыць і разумець геаграфічную карціну свету, усведамляць сваю ролю і прызначэнне ў свеце; умення выбіраць мэтавыя і сэнсавыя ўстаноўкі для сваіх дзеянняў і ўчынкаў, прымаць рашэнні;

фарміраванне ўменняў працаваць з картаграфічнымі крыніцамі інфармацыі: авалоданне практычнымі прыёмамі работы з картай, асэнсаванне зместу карты, развіццё прасторавага ўяўлення; выкарыстанне інфармацыі аб геаграфічных працэсах і з’явах (графічнай, статыстычнай, даведачнай, краязнаўчай), ажыццяўленне прасторава-тэрытарыяльнай прывязкі;

развіццё ў вучняў здольнасцей да камунікатыўнай дзейнасці: уменне геаграфічна аргументаваць вынікі назіранняў за працэсамі, якія адбываюцца ў прыродзе і грамадстве, падаваць іх рознымі спосабамі; уменне выкарыстоўваць міжасобасныя формы ўзаемадзеяння і зносін у працэсе навучання.

5. Рэкамендуюцца наступныя метады навучання і выхавання: гутарка, тлумачэнне, самастойная праца, наглядныя метады, практычныя работы і іншыя метады. З мэтай актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў выкарыстоўваюцца метады праблемнага разгляду, эўрыстычныя, даследчыя, метад праектаў, дыскусіі і іншыя метады.

У працэсе навучання мэтазгодна спалучаць формы навучання, якія прадугледжваюць арганізацыю актыўнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў па засваенні зместу адукацыі: франтальныя, групавыя, парныя і індывідуальныя.

Формы і метады навучання і выхавання педагагічны работнік выбірае самастойна на аснове мэт і задач вывучэння канкрэтнай тэмы.

6. Чаканыя вынікі вывучэння зместу вучэбнага прадмета «Геаграфія» па завяршэнні навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі:

6.1. асобасныя:

валодае сучасным светапоглядам, сістэмай каштоўнасных арыентацый, ідэйна-маральных, культурных і этычных прынцыпаў і норм паводзін;

разумее значнасць геаграфічнай адукацыі для асобаснага развіцця і самавызначэння;

усведамляе сябе членам грамадства на глабальным, рэгіянальным і лакальным узроўнях;

мае ўяўленне аб Рэспубліцы Беларусь як суб’екце сусветнай геаграфічнай прасторы, яе месцы і ролі ў сучасным свеце;

усведамляе гуманістычную сутнасць і маральную каштоўнасць навуковых ведаў, значнасць беражлівага стаўлення да прыроды Зямлі і прыродакарыстання, неабходнасць разумна выкарыстоўваць дасягненні геаграфічнай навукі ў інавацыйным развіцці грамадства;

выказвае гатоўнасць да выбару далейшай адукацыйнай траекторыі ў адпаведнасці са сваімі магчымасцямі, здольнасцямі і інтарэсамі.

6.2. метапрадметныя:

дэманструе ўстойлівую цікавасць да вучэбных дзеянняў (рэгулятыўных, вучэбна-пазнавальных, камунікатыўных, кааператыўных);

здольны ацэньваць інфармацыю і выказваць доказныя меркаванні, размяжоўваючы факты і разважанні; прымаць рашэнні ва ўмовах

празмернай колькасці ці недахопу інфармацыі; адаптуецца да розных жыццёвых сітуацый;

умее: крытычна мысліць і працаваць з інфармацыяй, вылучаць у ёй галоўнае; крытычна ацэньваць інфармацыю, атрыманую з розных крыніц, пісьменна інтэрпрэтаваць яе і выкарыстоўваць; адрозніваць істотныя прыметы працэсаў і з’яў ад неістотных; бачыць некалькі варыянтаў вырашэння праблемы, выбіраць найбольш аптымальны варыянт; інтэграваць веды з розных прадметных галін для рашэння практычных задач;

праяўляе цікавасць да новых форм вучэбнай дзейнасці (практычнай, даследчай, праектнай, іншых форм).

6.3. прадметныя:

валодае геаграфічнымі ведамі, уменнямі, навыкамі, спосабамі дзейнасці, якія неабходны пры вывучэнні іншых прадметаў;

валодае ведамі аб аб’ектах вывучэння фізічнай і сацыяльна-эканамічнай геаграфіі, а таксама ўменнямі, навыкамі і спосабамі дзейнасці;

умее характарызаваць фізіка-геаграфічныя асаблівасці прыроды мацерыкоў і акіянаў, вылучае агульныя і адметныя тэрытарыяльныя асаблівасці, эканоміка-геаграфічныя паказчыкі асобных краін, асаблівасці геаграфічнага і геапалітычнага становішча тэрыторый;

умее выбіраць мэтавыя і сэнсавыя ўстаноўкі для сваіх дзеянняў, прымаць рашэнні; здольны бачыць і разумець навакольны свет, усведамляць сваю ролю;

мае вопыт дзейнасці па ўжыванні геаграфічных ведаў і ўменняў у жыццёвых сітуацыях;

умее працаваць з картаграфічнымі крыніцамі інфармацыі, выкарыстоўваць інфармацыю аб геаграфічных працэсах і з’явах і ажыццяўляць прасторава-тэрытарыяльную прывязку;

здольны да камунікатыўнай дзейнасці: умее геаграфічна аргументаваць вынікі назіранняў за працэсамі, якія адбываюцца ў прыродзе і грамадстве, падаваць іх рознымі спосабамі.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў VI КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

(1 гадзіна ў тыдзень; усяго 35 гадзін,
з іх на абагульняючае паўтарэнне – 2 гадзіны)

### УВОДЗІНЫ (1 гадзіна)

Геаграфія як навука. Фізічная і сацыяльна-эканамічная геаграфія.

Абалонкі Зямлі: літасфера, гідрасфера, атмасфера, біясфера. Значэнне геаграфіі ў жыцці і гаспадарчай дзейнасці людзей.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення пра: аб’ект і прадмет вывучэння геаграфіі; сістэму геаграфічных навук; фізічную геаграфію; сацыяльна-эканамічную геаграфію; абалонкі Зямлі;

асноўнае паняцце: геаграфія;

умеюць:

адрозніваць геаграфічныя навукі па аб’ектах вывучэння;

тлумачыць ролю геаграфіі ў жыцці і гаспадарчай дзейнасці людзей.

## ЗЯМЛЯ НА ПЛАНЕ МЯСЦОВАСЦІ, ГЛОБУСЕ І КАРЦЕ (8 гадзін)

### Тэма 1. План мясцовасці (4 гадзіны)

Стораны гарызонту. Арыентаванне на мясцовасці. Компас. Азімут. Вызначэнне азімутаў з дапамогай компаса і напрамкаў па зададзеных азімутах.

План мясцовасці, умоўныя знакі. Маштаб і яго віды (лікавы, найменны, лінейны).

Абсалютная і адносная вышыні. Адлюстраванне вышынь зямной паверхні (ізалініі, гарызанталі). Чытанне плана мясцовасці.

Практычная работа

1. Чытанне плана мясцовасці. Вызначэнне азімутаў і напрамкаў па зададзеных азімутах з дапамогай компаса.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення пра: асноўныя і прамежныя стораны гарызонту; спосабы арыентавання на мясцовасці; адлюстраванне тэрыторыі на плане мясцовасці; віды ўмоўных знакаў;

асноўныя паняцці: арыентаванне, азімут, план мясцовасці, маштаб; умоўныя знакі, абсалютная і адносная вышыні; ізалініі, гарызанталі;

умеюць:

чытаць план мясцовасці (вызначаць аб’екты па ўмоўных знаках, стораны гарызонту, азімут, іх узаемараспалажэнне, абсалютную вышыню, адносную вышыню, напрамкі, адлегласці);

вызначаць маштаб, пераводзіць маштаб з аднаго віду ў іншы; працаваць з компасам;

працаваць з планам мясцовасці падчас чытання картаграфічнай інфармацыі.

Тэма 2. Глобус і геаграфічная карта (4 гадзіны)

Форма, памеры Зямлі. Глобус – мадэль Зямлі. Геаграфічныя полюсы. Градусная сетка: паралелі, геаграфічны полюс, экватар, мерыдыяны, пачатковы мерыдыян. Паўшар’і Зямлі.

Геаграфічныя каардынаты: геаграфічныя шырата і даўгата. Сучасныя спосабы вызначэння геаграфічных каардынат.

Геаграфічная карта. Адрозненні геаграфічнай карты ад плана мясцовасці. Адлюстраванне вышынь і глыбінь на глобусе і карце. Легенда карты. Адрозненні карт па маштабе, ахопе тэрыторыі, змесце. Значэнне карт у геаграфіі, жыцці і гаспадарчай дзейнасці людзей.

Практычная работа

2*. Вызначэнне геаграфічных каардынат па картах і нанясенне геаграфічных аб’ектаў па зададзеных каардынатах на контурную карту.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення пра: глобус; паўшар’і Зямлі; дробнамаштабныя, сярэднемаштабныя, буйнамаштабныя карты; сусветныя карты, карты асобных мацерыкоў і акіянаў, частак мацерыкоў; агульнагеаграфічныя, у тым ліку тапаграфічныя, тэматычныя, спецыяльныя картыў; значэнні геаграфічных карт; фізічныя і тапаграфічныя карты; спосабы вызначэння геаграфічных каардынат;

асноўныя паняцці: геаграфічны полюс, мерыдыян, экватар, паралель, градусная сетка, геаграфічная карта, геаграфічная шырата, геаграфічная даўгата, геаграфічныя каардынаты.

умеюць:

тлумачыць адрозненні плана ад карты;

адрозніваць геаграфічныя карты па маштабе, ахопе тэрыторыі, змесце;

паказваць на карце і глобусе: геаграфічныя полюсы, экватар, пачатковы мерыдыян;

вызначаць адлегласці па картах і глобусе (з дапамогай маштабу, па мерыдыянах і паралелях), геаграфічныя каардынаты і напрамкі;

абазначаць геаграфічныя аб’екты на контурнай карце.

## АБАЛОНКІ ЗЯМЛІ (24 гадзіны)

### Тэма 3. Літасфера (7 гадзін)

Унутраная будова Зямлі: ядро, мантыя, зямная кара. Будова і магутнасць зямной кары. Тыпы зямной кары: мацерыковая і акіянічная. Літасфера.

Горныя пароды і мінералы зямной кары. Магматычныя, асадкавыя і метамарфічныя горныя пароды. Выкарыстанне і ахова нетраў Зямлі.

Унутраныя сілы Зямлі. Вулканізм. Утварэнне і будынак вулкана. Адрозненне вулканаў па форме і актыўнасці. Вулканічныя паясы.

Землетрасенні: прычыны і геаграфічнае распаўсюджванне. Сейсмічныя паясы. Знешнія сілы Зямлі. Выветрыванне: фізічнае, хімічнае, біялагічнае.

Рэльеф Зямлі. Асноўныя формы рэльефу сушы: горы, раўніны. Адрозненне гор па вышыні.

Адрозненне раўнін па характары паверхні, абсалютнай вышыні.

Рэльеф дна Сусветнага акіяна (падводная ўскраіна мацерыкоў, ложа акіяна, пераходная зона, сярэдне-акіянічныя хрыбты).

Практычная работа

3. Апісанне па геаграфічнай карце раўнін, горных краін (на выбар).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ<br>ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення пра: будову і тыпы зямной кары; літасферныя пліты; знешнія і ўнутраныя сілы Зямлі; сейсмічныя і вулканічныя паясы; магму, лаву; будову вулкана; адрозненне вулканаў па форме і актыўнасці; горныя пароды (магматычныя, асадкавыя, метамарфічныя), эпіцэнтр і ачаг землетрасення; адрозненне гор па вышыні; адрозненне раўнін па вышыні і форме; астраўныя дугі; рыфты;

асноўныя паняцці: літасфера, ядро, мантыя, зямная кара, мінералы, горныя пароды, вулкан, землетрасенне, выветрыванне, рэльеф, гара,

раўніна, шэльф, ложа акіяна, глыбакаводны жолаб, сярэдне-акіянічны хрыбет;

умеюць:

паказваць на карце вулканы – Везувій, Кіліманджара, Геклу, Ключэўскую Сопку; горы – Альпы, Атлас, Вялікі Водападзельны хрыбет, масіў Вінсан, Каўказ, Уральскія, Гімалаі (г. Джамалунгму), Кардыльеры, Анды; раўніны – Усходне-Еўрапейскую раўніну, Лаўрэнційскае ўзвышша, Амазонскую нізіну, Сярэднесібірскае пласкагор’е, упадзіну Гхор; сярэдне-акіянічны хрыбет – Сярэдне-Атлантычны; Марыянскі жолаб; Паўночна-Усходнюю катлавіну; Ціхаакіянскае вулканічнае (вогненнае) кольца;

тлумачыць адрозненні мацерыковай і акіянічнай зямной кары, фізічнага, хімічнага, біялагічнага выветрывання; магматычных, асадкавых і метамарфічных горных парод;

вызначаць па карце адрозненні раўнін і гор па вышыні, раўнін – па характары паверхні;

абазначаць на контурнай карце асноўныя формы рэльефу;

працаваць з геаграфічнай картай для апісання раўнін і горных краін згодна з прапанаваным планам.

## Тэма 4. Атмасфера (7 гадзін)

Атмасфера. Састаў атмасферы. Будова атмасферы (трапасфера, стратасфера і верхнія слаі атмасферы). Значэнне атмасферы. Азонавы слой.

Тэмпература паветра. Сярэдняя тэмпература, амплітуда тэмператур (сутачная, гадавая). Змяненне тэмпературы з вышынёй. Размеркаванне тэмпературы паветра па зямной паверхні. Цеплавыя паясы.

Атмасферны ціск. Змяненне атмасфернага ціску з вышынёй. Размеркаванне атмасфернага ціску па зямной паверхні.

Вецер. Напрамак, хуткасць і сіла ветру. Пастаянныя вятры (пасаты, заходнія вятры, усходнія вятры палярных абласцей). Сезонныя вятры (мусоны). Мясцовыя вятры (брызы). Вільготнасць паветра: абсалютная і адносная. Атмасферныя ападкі: утварэнне і размеркаванне па паверхні Зямлі.

Надвор’е. Метэаралагічныя элементы: тэмпература паветра, атмасферны ціск, вецер, вільготнасць паветра. Метэаралагічныя (пагодныя) з’явы. Назіранне за надвор’ем.

Клімат. Кліматаўтваральныя фактары: геаграфічная шырата, размеркаванне сушы і акіяна, акіянічныя цячэнні, рэльеф мясцовасці.

Практычная работа

4*. Апрацоўка матэрыялаў назіранняў за надвор’ем і апісанне надвор’я сваёй мясцовасці (складанне графіка ходу тэмпературы і ружы

вятроў, разлік сярэдніх тэмператур, амплітуды тэмператур).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення пра: пласты атмасферы, азонавы слой; пастаянныя і сезонныя вятры; мясцовыя вятры; кліматаўтваральныя фактары; метэаралагічныя (пагодныя) з’явы; метэаралагічныя прыборы; метэаназіранні і прагноз надвор’я;

асноўныя паняцці: атмасфера, надвор’е, атмасферны ціск, вецер, пасаты, мусон, брыз, абсалютная і адносная вільготнасць паветра, атмасферныя ападкі, клімат;

умеюць:

характарызаваць састаў і будову атмасферы, цеплавыя паясы; тлумачыць размеркаванне атмасфернага ціску па зямной паверхні, змяненне атмасфернага ціску з вышынёй; размеркаванне тэмпературы паветра па зямной паверхні, змяненне тэмпературы з вышынёй; размеркаванне ападкаў па паверхні Зямлі; распаўсюджванне пастаянных вятроў; уплыў асноўных кліматаўтваральных фактараў на клімат;

карыстацца тэрмометрам, барометрам;

складаць апісанне надвор’я, графікі ходу тэмпературы, ружу вятроў; вылічваць сярэднія тэмпературы і амплітуды тэмператур, а таксама вышыню гары па тэмпературах каля падножжа і на вяршыні і наадварот;

працаваць з данымі назірання для пабудовы графікаў і ружы вятроў.

### Тэма 5. Гідрасфера (8 гадзін)

Гідрасфера. Будова гідрасферы. Сусветны акіян і яго часткі. Мора. Залівы. Пралівы. Тэмпература, салёнасць акіянічных вод.

Рух вады ў акіяне – марскія хвалі, цунамі, прылівы і адлівы. Цёплыя і халодныя акіянічныя цячэнні.

Воды сушы: паверхневыя і падземныя. Віды падземных вод: глебавыя, грунтавыя і міжпластавыя. Гейзеры.

Рака і яе часткі. Рачная даліна і яе элементы (рэчышча, пойма, тэраса). Рачная сістэма, рачны басейн, водападзел.

Раўнінныя і горныя рэкі. Вадаспады. Жыўленне рэк (снегавое, дажджавое, ледніковае, падземнае, змяшанае). Водны рэжым рэк.

Работа рэк (рачная эрозія, меандраванне), работа часовых вадацёкаў (роваўтварэнне). Работа падземных вод (карст).

Азёры: сцёкавыя і бяссцёкавыя, прэсныя і салёныя. Асноўныя тыпы азёрных катлавін: тэктанічныя, вулканічныя, ледніковыя, карставыя, запрудныя. Балоты: утварэнне і значэнне.

Ледавікі, іх утварэнне і будова. Мацярыковыя і горныя ледавікі. Уздзеянне ледавікоў на рэльеф. Значэнне гідрасферы ў жыцці людзей і яе ахова.

Практычная работа

5. Апісанне воднага аб'екта сваёй мясцовасці згодна з планам.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення пра: цёплыя і халодныя акіянічныя цячэнні; прыліў, адліў, тэмпературу і салёнасць акіянічных вод; унутраныя і ўскраінныя моры; воды сушы, віды падземных вод; водападзел, рачную сістэму і яе элементы, жыўленне рэк; гейзеры, фазы воднага рэжыму рэк (разводдзе, межань, паводка), прэсныя і салёныя азёры, сцёкавыя і бяссцёкавыя азёры; снегавую лінію і ўздзеянне ледавікоў на рэльеф; змяненне вод гідрасферы пад уплывам гаспадарчай дзейнасці чалавека;

асноўныя паняцці: гідрасфера, Сусветны акіян, мора, заліў, праліў, хваля, цунамі, акіянічныя цячэнні, падземныя воды, паверхневыя воды, рака, рачная даліна, рэчышча, пойма, рачны басейн, вадаспад, роў, карст, возера, ледавік, балота;

умеюць:

паказваць на карце моры – Міжземнае, Чырвонае, Балтыйскае; залівы – Гвінейскі, Бенгальскі, Мексіканскі; пралівы – Берынгаў, Гібралтарскі, Магеланаў; цячэнні – Гальфстрым, Заходніх Вятроў; Заходне-Сібірскі артэзіянскі басейн; рэкі – Амазонку, Місісіпі, Ніл, Конга, Янцзы, Волгу, Мурэй; азёры – Байкал, Верхняе, Каспійскае мора, Мёртвае мора; вадаспад Анхель; ледавік Федчанкі; Васюганскія балоты.

тлумачыць прычыны ўтварэння марскіх хваль, прыліваў і адліваў, цунамі; фазы воднага рэжыму рэк; адрозненні тыпаў жыўлення рэк, раўнінных рэк ад горных, грунтавых вод ад міжпластавых, мацерыковых ледавікоў ад горных, азёрных катлавін;

характарызаваць асобныя рэкі і азёры згодна з прапанаваным планам, значэнне гідрасферы для жыцця людзей;

абазначаць на контурнай карце рэкі, вадаспады, азёры, балоты, ледавікі;

апісваць унутраныя воды сваёй мясцовасці згодна з планам.

Тэма 6. Біясфера (2 гадзіны)

Біясфера і яе межы. Разнастайнасць жывых арганізмаў. Асаблівасці распаўсюджвання жывых арганізмаў. Роля жывых арганізмаў у біясферы. Глеба: састаў, будова, урадлівасць. Разнастайнасць глебавага покрыва (асноўныя тыпы глеб). Значэнне глебы ў гаспадарчай дзейнасці людзей. Эрозія глеб.

Прыродны комплекс. Кампаненты прыроднага комплексу. Разнастайнасць і ахова прыродных комплексаў Зямлі.

Практычная работа

6. Апісанне прыроднага комплексу сваёй мясцовасці згодна з планам.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення пра: межы і асаблівасці біясферы; урадлівасць глебы; састаў і будову глеб; асноўныя тыпы глеб;

асноўныя паняцці: біясфера, глеба, перагной, эрозія глеб, прыродны комплекс;

умеюць:

характарызаваць разнастайнасць глебавага покрыва, жывых арганізмаў, ролю жывых арганізмаў і асаблівасці іх размеркавання ў біясферы;

тлумачыць прычыны разнастайнасці прыродных комплексаў сушы, значэнне глеб у гаспадарчай дзейнасці людзей;

працаваць згодна з прапанаваным планам пры апісанні прыроднага комплексу сваёй мясцовасці.

# ГЛАВА 3
# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў VII КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

(1 гадзіна ў тыдзень; усяго 35 гадзін, з іх на абагульняючае паўтарэнне – 2 гадзіны)

## УВОДЗІНЫ (1 гадзіна)

Геаграфічная абалонка як аб’ект вывучэння геаграфіі. Межы і асноўныя ўласцівасці геаграфічнай абалонкі: цэласнасць, рытмічнасць (сутачная, гадавая), кругаварот рэчываў і энергіі, занальнасць і азанальнасць.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ЗЯМНОГА ШАРА (5 гадзін)

## Тэма 1. Агульная характарыстыка прыроды мацерыкоў і акіянаў (5 гадзін)

Тэорыя літасферных пліт. Глабальныя складкаватыя паясы. Платформы: будова (платформенныя пліты і шчыты) і іх адрозненне па ўзросце.

Глабальныя формы рэльефу Зямлі: мацерыковыя ўзняцці і акіянічныя ўпадзіны. Паходжанне гор (складкаватыя, глыбавыя, складкавата-глыбавыя, вулканічныя).

Паветраныя масы і іх асноўныя тыпы. Атмасферныя франты. Цыклоны і антыцыклоны, звязаныя з імі тыпы надвор'я.

Кліматычныя паясы Зямлі (экватарыяльны, субэкватарыяльны, трапічныя, субтрапічныя, умераныя, субарктычны і субантарктычны, арктычны і антарктычны). Кліматычныя вобласці і тыпы клімату.

Геаграфічныя паясы і прыродныя зоны Зямлі (вільготныя экватарыяльныя лясы, саванны і рэдкалессі, пустыні, вечназялёныя цвёрдалістовыя лясы і хмызнякі, стэпы, шыракалістыя, змешаныя і хвойныя (тайга) лясы, тундра, арктычныя (антарктычныя) пустыні). Вышынная пояснасць (на прыкладзе Альпаў).

Практычная работа

1. Аналіз геаграфічнага праяўлення шыротнай занальнасці па тэматычных картах.

# АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення пра: заканамернасці геаграфічнай абалонкі; тэорыю літасферных пліт; шыротную занальнасць, азанальнасць, вышынную пояснасць; будову платформы (крышталічны падмурак, асадкавы чахол); горст, грабен, скід; тыпы паветраных мас;

асноўныя паняцці: геаграфічная абалонка, літасферная пліта, складкаваты пояс, платформа, платформенная пліта, шчыт; паветраная маса, атмасферны фронт, цыклон і антыцыклон, кліматычны пояс, прыродная зона; пустыня;

заканамернасці геаграфічнай абалонкі і закон геаграфічнай занальнасці;

умеюць:

паказваць на карце: літасферныя пліты – Еўразійскую, Ціхаакіянскую; складкаватыя паясы – Ціхаакіянскі, Альпійска-Гімалайскі, Урала-Мангольскі; платформы – Аравійскую, Індастанскую, Усходне-Еўрапейскую, Заходне-Сібірскую пліту; горы – Скандынаўскія, Драконавыя, Пірэнеі; вулкан Фудзіяму; раўніны – Прыкаспійскую нізіну, Інда-Гангскую нізіну; пласкагор’е Дэкан; кліматычныя паясы; прыродныя зоны;

апісваць кліматычныя паясы, прыродныя зоны;

тлумачыць праяўленне заканамернасцей развіцця геаграфічнай абалонкі; цыркуляцыю атмасферы; прычыны змены кліматычных паясоў і прыродных зон; праблемы захавання прыроднай разнастайнасці на Зямлі;

вызначаць узаемасувязі паміж асобнымі кампанентамі прыроды;

працаваць з тэматычнымі картамі для аналізу геаграфічнага праяўлення шыротнай занальнасці.

## РЭГІЯНАЛЬНЫ АГЛЯД ЗЯМНОГА ШАРА (27 гадзін)

### Тэма 2. Акіяны (2 гадзіны)

Атлантычны і Паўночны Ледавіты акіяны. Агульная характарыстыка акіянаў: асаблівасці геаграфічнага становішча, межы, памеры, зрэзанасць берагавой лініі. Астравы і іх тыпы, моры, залівы, пралівы. Рэльеф дна акіянаў. Цячэнні. Мінеральныя і біялагічныя рэсурсы, іх выкарыстанне і ахова.

Ціхі і Індыйскі акіяны. Агульная характарыстыка акіянаў: асаблівасці геаграфічнага становішча, межы, памеры, зрэзанасць берагавой лініі. Астравы і іх тыпы, моры, залівы, пралівы. Рэльеф дна акіянаў. Схемы цячэнняў. Мінеральныя і біялагічныя рэсурсы, іх выкарыстанне і ахова.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення пра: мінеральныя і біялагічныя рэсурсы акіянаў; схему акіянічных цячэнняў;

асноўныя паняцці: мацерыковыя, вулканічныя і каралавыя астравы;

умеюць:

паказваць на карце: моры – Ахоцкае, Аравійскае, Баранцава; залівы – Аляска, Фарсі; жалабы – Зондскі, Чылійскі; Канадскую катлавіну; цячэнні – Курасіа, Паўночнае Пасатнае, Паўднёвае Пасатнае, Паўночна-Атлантычнае, Лабрадорскае; астравы і групы астравоў – Грэнландыю, Вялікабрытанію, Вялікія Зондскія, Ісландыю, Японскія;

апісваць асаблівасці геаграфічнага становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы акіянаў;

тлумачыць асноўныя рысы будовы рэльефу дна;

вызначаць па карце глыбіню і працягласць акіянаў з захаду на ўсход і з поўначы на поўдзень;

працаваць з тэматычнымі картамі і крыніцамі геаграфічнай інфармацыі для параўнальнай характарыстыкі акіянаў.

Тэма 3. Афрыка (5 гадзін)

Геаграфічнае становішча. Геаграфічныя адкрыцці і даследаванні мацерыка (Б. Дыяш, Васка да Гама, Д. Лівінгстан).

Будова зямной кары: Афрыканская платформа, складкаватыя вобласці. Рэльеф. Усходне-Афрыканскія рыфты. Карысныя выкапні.

Клімат. Кліматычныя паясы і тыпы клімату.

Унутраныя воды. Буйныя рачныя сістэмы, вадзі, азёры, вадаспады. Артэзіянскія басейны.

Прыродныя зоны. Апустыньванне (зона Сахеля). Ахова прыроды Афрыкі. Нацыянальныя паркі.

Практычная работа

2. Характарыстыка геаграфічнага становішча Афрыкі і нанясенне на контурную карту яго элементаў.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення: гісторыю даследавання мацерыка; пра асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі мацерыка Афрыкі (нацыянальныя паркі Вірунга, Серэнгеці);

асноўныя паняцці: саванна, рыфт, вадзі, дэльта, аазіс, эндэмік, дзюна;

даследчыкаў Афрыкі; кліматычныя паясы і прыродныя зоны; характэрных прадстаўнікоў і эндэмікаў жывёльнага і расліннага свету Афрыкі;

умеюць:

паказваць на карце: Мазамбікскі праліў; Адэнскі заліў; паўвостраў Самалі; востраў Мадагаскар; цячэнні – Мазамбікскае, Бенгельскае; Капскія горы; Эфіёпскае нагор’е; Усходне-Афрыканскае пласкагор’е; упадзіну возера Асаль; катлавіну Конга; вулкан Камерун; найбуйнейшыя радовішчы карысных выкапняў; пустыні – Сахару, Наміб; рэкі – Нігер, Замбезі; Суэцкі канал; азёры – Чад, Вікторыя, Танганьіка; вадаспад Вікторыя;

характарызаваць асаблівасці геаграфічнага становішча Афрыкі; асноўныя рысы будовы зямной кары і асаблівасці рэльефу мацерыка; асаблівасці клімату, распалажэння кліматычных паясоў, а таксама асаблівасці ўнутраных вод, расліннага і жывёльнага свету, глеб прыродных зон;

тлумачыць своеасаблівасць расліннага і жывёльнага свету Афрыкі; вызначаць па кліматычных картах і кліматаграмах асноўныя рысы клімату асобных абласцей мацерыка;

выяўляць прычынна-выніковыя сувязі паміж будовай зямной кары і рэльефам, геаграфічным становішчам мацерыка і кліматам, кліматам і ўнутранымі водамі, кліматам і прыроднымі зонамі;

працаваць з картай падчас вызначэння геаграфічнага становішча мацерыка, нанясення геаграфічных аб’ектаў на контурную карту.

Тэма 4. Аўстралія і Акіянія (3 гадзіны)

Аўстралія і Акіянія. Геаграфічнае становішча. Адкрыццё і даследаванні мацерыка і Акіяніі (В. Янсзан, А. Тасман, Дж. Кук). Будова зямной кары: Аўстралійская платформа, Усходне-Аўстралійскі складкаваты пояс. Асаблівасці рэльефу. Карысныя выкапні.

Кліматычныя паясы і тыпы клімату. Паверхневыя воды. Крыкі. Падземныя воды і артэзіянскія басейны.

Прыродныя зоны. Эндэмізм жывёльнага і расліннага свету Аўстраліі і Акіяніі. Ахова прыроды Аўстраліі і Акіяніі. Нацыянальныя паркі.

Практычная работа

3*. Фізіка-геаграфічная характарыстыка Заходне-Аўстралійскага пласкагор’я або Вялікага Водападзельнага хрыбта Аўстраліі (на выбар).

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення пра: адкрыццё і гісторыю даследавання Аўстраліі і Акіяніі; прыродна-гістарычныя вобласці Акіяніі: Меланезію, Мікранезію, Палінезію і Новую Зеландыю; асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі мацерыка – нацыянальны парк Блу-Маўнцінс;

асноўныя паняцці: крык, скрэб, рэлікт;

даследчыкаў Аўстраліі і Акіяніі; кліматычныя паясы і прыродныя зоны; характэрных прадстаўнікоў і эндэмікаў жывёльнага і расліннага свету Аўстраліі і Акіяніі;

умеюць:

паказваць на карце: залівы – Карпентарыя, Вялікі Аўстралійскі; астравы і групы астравоў – Вялікі Бар’ерны рыф, Новую Гвінею, Гавайскія, Тасманію, Новую Зеландыю; паўастравы – Кейп-Ёрк, Арнем-Ленд; Аўстралійскую платформу; гару Касцюшкі; раўніну – Заходне-Аўстралійскае пласкагор’е; Вялікую пустыню Вікторыя; рэкі – Дарлінг, Купер-Крык; возера Эйр-Норт; вулкан Кілаўэа; кліматычныя паясы; прыродныя зоны; радовішчы карысных выкапняў;

характарызаваць асаблівасці геаграфічнага становішча Аўстраліі і Акіяніі; асноўныя рысы будовы зямной кары і асаблівасці рэльефу мацерыка; асаблівасці клімату, распалажэння кліматычных паясоў, а таксама асаблівасці ўнутраных вод, расліннасці, жывёльнага свету і глеб прыродных зон;

тлумачыць своеасаблівасць расліннага і жывёльнага свету Аўстраліі і Акіяніі;

вызначаць па кліматычных картах і кліматаграмах асноўныя рысы клімату асобных абласцей Аўстраліі і Акіяніі;

выяўляць прычынна-выніковыя сувязі паміж будовай зямной кары і рэльефам, геаграфічным становішчам мацерыка і кліматам, кліматам і ўнутранымі водамі, кліматам і прыроднымі зонамі;

працаваць з крыніцамі геаграфічнай інфармацыі, выкарыстоўваць план для фізіка-геаграфічнай характарыстыкі і параўнання ўсходняй і заходняй частак Аўстраліі.

## Тэма 5. Паўднёвая Амерыка (5 гадзін)

Геаграфічнае становішча Паўднёвай Амерыкі. Гісторыя адкрыцця і геаграфічныя даследаванні (Х. Калумб, Ф. Магелан, А. Гумбальт, І. Дамейка).

Будова зямной кары: Паўднёва-Амерыканская платформа, Андыйскі складкаваты пояс. Рэльеф: горы, пласкагор’і, нізіны. Вобласці вулканізму. Карысныя выкапні.

Клімат. Кліматычныя паясы і тыпы кліматаў.

Унутраныя воды. Водныя рэсурсы. Асноўныя рачныя басейны. Галоўныя рэкі і азёры, вадаспады. Амазонка – самая доўгая і паўнаводная рака Зямлі.

Прыродныя зоны. Вышынная пояснасць Анд. Ахова прыроды і нацыянальныя паркі.

Практычная работа

4. Параўнальная характарыстыка рэк Амазонкі і Ніла згодна з планам.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення пра: даследаванне Паўднёвай Амерыкі; асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі мацерыка (нацыянальныя паркі: Галапагос);

асноўныя паняцці: лагуна, льянас, какмпас, гілея, пампа; даследчыкаў Паўднёвай Амерыкі; кліматычныя паясы і прыродныя зоны; характэрных прадстаўнікоў і эндэмікаў жывёльнага і расліннага свету Паўднёвай Амерыкі;

умеюць:

паказваць на карце: востраў Вогненная Зямля; Карыбскае мора; праліў Дрэйка; заліў Ла-Плата; цячэнні – Перуанскае, Бразільскае; Паўднёва-Амерыканскую платформу; гару Аканкагуа; вулкан Катапахі; пласкагор’і – Бразільскае, Гвіянскае; нізіны – Амазонскую, Арынокскую, Лаплатскую; пустыню Атакама; рэкі – Парана (вадаспад Ігуасу), Арынока; возера Ціцікака; радовішчы карысных выкапняў; кліматычныя паясы; прыродныя зоны;

характарызаваць асаблівасці геаграфічнага становішча Паўднёвай Амерыкі; асноўныя рысы будовы зямной кары, асаблівасці рэльефу мацерыка, клімату, распалажэння кліматычных паясоў, а таксама асаблівасці ўнутраных вод;

тлумачыць своеасаблівасць расліннага і жывёльнага свету Паўднёвай Амерыкі;

вызначаць па кліматычных картах і кліматаграмах асноўныя рысы клімату асобных абласцей Паўднёвай Амерыкі;

выяўляць прычынна-выніковыя сувязі паміж геаграфічным становішчам мацерыка і кліматам, будовай зямной кары і рэльефам, кліматам і ўнутранымі водамі, кліматам і прыроднымі зонамі;

працаваць з крыніцамі геаграфічнай інфармацыі і выкарыстоўваць план для параўнання рэк Амазонкі і Ніла.

### Тэма 6. Паўночная Амерыка (5 гадзін)

Геаграфічнае становішча. Гісторыя адкрыцця і геаграфічныя даследаванні (Э. Рыжы, В. Берынг).

Будова зямной кары: Паўночна-Амерыканская платформа, Кардыльерскі складкаваты пояс. Рэльеф мацерыка. Уплыў старажытнага абледзянення на рэльеф мацерыка. Карысныя выкапні.

Клімат мацерыка і яго асаблівасці. Кліматычныя паясы і тыпы клімату.

Унутраныя воды. Асаблівасці воднага рэжыму і гаспадарчага выкарыстання рэк. Азёры і іх тыпы. Вялікія Амерыканскія азёры. Сучаснае абледзяненне мацерыка. Вечная мерзлата.

Прыродныя зоны, асаблівасці іх распаўсюджвання. Ахова прыроды і нацыянальныя паркі.

Практычная работа

5. Вызначэнне сувязі паміж будовай зямной кары, рэльефам і карыснымі выкапнямі па геаграфічных картах (на прыкладзе Паўночнай Амерыкі).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення: гісторыю даследавання Паўночнай Амерыкі; пра асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі Паўночнай Амерыкі (нацыянальныя паркі Елаўстанскі, Мамантава пячора, Секвоя);

асноўныя паняцці: каньён, прэрыя, фіёрд, абледзяненне, вечная мерзлата;

даследчыкаў мацерыка; кліматычныя паясы і прыродныя зоны Паўночнай Амерыкі; характэрных прадстаўнікоў і эндэмікаў жывёльнага і расліннага свету;

умеюць:

паказваць на карце: цячэнні – Каліфарнійскае, Аляскінскае; Берынгава мора; Гудзонаў заліў; Дэвісаў праліў; Канадскі Арктычны архіпелаг; паўвостраў Лабрадор; платформу – Паўночна-Амерыканскую; горы – Дэналі, Скалістыя, Апалачы; нагор’е – Мексіканскае; плато – Вялікі Басейн; вулкан Арысаба; раўніны – Цэнтральныя, Вялікія; упадзіну Даліна Смерці; кліматычныя паясы; рэкі – Святога Лаўрэнція, Каларада, Макензі, Юкан; Панамскі канал; Ніагарскі вадаспад; азёры – Вялікае Мядзведжае, Вялікае Салёнае; прыродныя зоны; радовішчы карысных выкапняў;

характарызаваць геаграфічнае становішча Паўночнай Амерыкі; асноўныя рысы будовы зямной кары, асаблівасці рэльефу мацерыка, клімату, распалажэння кліматычных паясоў, а таксама асаблівасці ўнутраных вод;

тлумачыць своеасаблівасць расліннага і жывёльнага свету Паўночнай Амерыкі;

вызначаць па кліматычных картах асноўныя рысы клімату асобных абласцей Паўночнай Амерыкі;

выяўляць прычынна-выніковыя сувязі паміж геаграфічным становішчам мацерыка і кліматам, будовай зямной кары і рэльефам, кліматам і ўнутранымі водамі, кліматам і прыроднымі зонамі;

працаваць з картай будовы зямной кары і фізічнай картамі для вызначэння прычынна-выніковых сувязей паміж будовай зямной кары, рэльефам і карыснымі выкапнямі.

## Тэма 7. Еўразія (5 гадзін)

Геаграфічнае становішча. Памеры і канфігурацыя. Склад тэрыторыі: Еўропа, Азія, іх рэгіёны. Геаграфічныя даследаванні і адкрыцці ў Еўразіі. Шлях «з варагаў у грэкі» і Вялікі шаўковы шлях. Уклад рускіх даследчыкаў у вывучэнне прыроды мацерыка. Уклад ураджэнцаў Беларусі ў даследаванне Еўразіі (Я. Д. Чэрскі, Б. І. Дыбоўскі).

Будова зямной кары: старажытныя і маладыя платформы, Альпійска-Гімалайскі і Ціхаакіянскі глабальныя складкаватыя паясы. Асноўныя формы рэльефу мацерыка. Роля старажытных мацерыковых абледзяненняў у фарміраванні рэльефу Еўразіі. Распалажэнне карысных выкапняў.

Клімат. Кліматаўтваральныя фактары Еўразіі. Кліматычныя паясы і тыпы клімату. Кантынентальнасць клімату. Асаблівасці фарміравання мусонных тыпаў клімату.

Унутраныя воды. Найбуйнейшыя рачныя сістэмы Еўразіі. Азёры і тыпы іх катлавін. Каналы. Сучаснае абледзяненне. Вечная мерзлата.

Геаграфічныя паясы і прыродныя зоны Еўразіі. Зоны арктычнага, субарктычнага, умеранага, субтрапічнага, трапічнага, субэкватарыяльнага і экватарыяльнага геаграфічных паясоў. Вышынная пояснасць у Гімалаях. Ахова прыроды і нацыянальныя паркі.

Практычная работа

6*. Аналіз кліматычных характарыстык Еўразіі пры руху з захаду на ўсход (уздоўж 50-й паралелі паўночнай шыраты).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення: гісторыю даследавання Еўразіі; пра асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі Еўразіі (нацыянальныя паркі і запаведнікі: Сіхатэ-Алінскі, Рэпетэкскі);

даследчыкаў Еўразіі; кліматычныя паясы і прыродныя зоны;

характэрных прадстаўнікоў і эндэмікаў жывёльнага і расліннага свету Еўразіі.

асноўныя паняцці: кантынентальнасць клімату;

умеюць:

паказваць на карце: моры – Паўночнае, Паўднёва-Кітайскае; праліў Басфор; Біскайскі заліў; паўастравы – Скандынаўскі, Пірэнэйскі, Аравійскі, Індакітай, Індастан; Сібірскую платформу; горы – Карпаты, Цянь-Шань; нагор'і – Тыбецкае, Памір; раўніны – Вялікую Кітайскую, Заходне-Сібірскую; пустыні – Гобі, Руб-эль-Халі; рэкі – Дунай, Об, Енісей, Лену, Амур, Хуанхэ; Ладажскае возера, Аральскае мора;

характарызаваць асаблівасці геаграфічнага становішча Еўразіі; асноўныя рысы будовы зямной кары, асаблівасці рэльефу мацерыка, клімату, распалажэння кліматычных паясоў, а таксама асаблівасці ўнутраных вод;

тлумачыць своеасаблівасць расліннага і жывёльнага свету Еўразіі; вызначаць па кліматычных картах і кліматаграмах асноўныя рысы клімату асобных абласцей Еўразіі;

выяўляць прычынна-выніковыя сувязі паміж геаграфічным становішчам мацерыка і кліматам, будовай зямной кары і рэльефам, геаграфічным становішчам, кліматам і прыроднымі зонамі;

працаваць з кліматычнымі картамі і дыяграмамі для супастаўлення кліматычных характарыстык Еўразіі па 50-й паралелі паўночнай шыраты.

### Тэма 8. Антарктыда (2 гадзіны)

Геаграфічнае становішча Антарктыды і Антарктыкі. Памер і берагавая лінія. Адкрыццё Антарктыды рускімі мараплаўцамі (Ф. Белінсгаўзен, М. Лазараў). Заваяванне Паўднёвага полюса (Р. Амундсен, Р. Скот).

Асноўныя рысы прыроды. Будова зямной кары і падлёдны рэльеф. Кліматаўтваральныя фактары. Асаблівасці клімату. Полюс холаду. Клімат і кліматычныя паясы.

Абледзяненне. Покрыўныя і шэльфавыя леднікі. Запасы прэснай вады. Падлёдныя вадаёмы. Асаблівасці арганічнага свету. Сучасныя даследаванні. Роля беларускіх вучоных у даследаваннях мацерыка.

Уплыў Антарктыды на прыроду Зямлі. Праблема азонавага слоя.

Ахова прыроды.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення пра: адкрыццё і даследаванні Антарктыды (станцыі: «Усход», «Гара Вячэрняя»); азонавую дзірку.

асноўныя паняцці: шэльфавы ледавік, антарктычная пустыня, сцёкавыя вятры, антарктычны аазіс;

першаадкрывальнікаў мацерыка, беларускіх даследчыкаў; кліматычныя паказчыкі; прадстаўнікоў арганічнага свету;

умеюць:

паказваць на карце: моры – Роса, Уэдэла; Антарктычны паўвостраў; Антарктычную платформу; горы – Трансантарктычныя, Антарктычныя Анды; упадзіну Бэнтлі; вулкан Эрабус; возера Усход; шэльфавы ледавік Роса;

характарызаваць асаблівасці геаграфічнага становішча мацерыка; асноўныя рысы будовы зямной кары мацерыка; асаблівасці клімату, абледзянення, расліннасці і жывёльнага свету;

тлумачыць адрозненне паняццяў «Антарктыда» і «Антарктыка»; асаблівасці падлёднага рэльефу, своеасаблівасць расліннага і жывёльнага свету; уплыў Антарктыды на прыроду Зямлі;

выяўляць прычынна-выніковыя сувязі паміж геаграфічным становішчам мацерыка і кліматам, будовай зямной кары і рэльефам, кліматам і прыроднымі зонамі.

## ГЛАВА 4
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў VIII КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

(2 гадзіны ў тыдзень; усяго 70 гадзін, з іх на абагульняючае паўтарэнне – 4 гадзіны і 1 гадзіна – рэзервовы час)

### УВОДЗІНЫ (1 гадзіна)

Сацыяльна-эканамічная геаграфія. Аб’ект і прадмет вывучэння. Роля ў жыцці чалавека і грамадства. Рэгіёны свету ў сацыяльна-эканамічнай геаграфіі па класіфікацыі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (далей – ААН).

### НАСЕЛЬНІЦТВА І ЯГО ГАСПАДАРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ (31 гадзіна)

#### Тэма 1. Палітычная карта свету (3 гадзіны)

Палітычная карта свету і асаблівасці яе фарміравання. Краіны і дзяржавы ў сацыяльна-эканамічнай геаграфіі. Суверэнныя дзяржавы і залежныя тэрыторыі. Тэрыторыя дзяржавы і дзяржаўная мяжа.

Дзяржавы па формах праўлення (рэспубліка, манархія), палітыка-тэрытарыяльным ладзе (унітарная, федэратыўная). Найбуйнейшыя дзяржавы свету па памерах тэрыторыі і колькасці насельніцтва.

Дынамічнасць палітычнай карты свету, якасныя і колькасныя змены на палітычнай карце. Этапы фарміравання палітычнай карты свету.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення пра: сацыяльна-эканамічную геаграфію (па класіфікацыі ААН), аб’ект і прадмет вывучэння сацыяльна-эканамічнай геаграфіі; асаблівасці фарміравання палітычнай карты свету;

віды палітыка-тэрытарыяльнага ладу; формы праўлення ў дзяржавах;

асноўныя паняцці: палітычная карта, суверэнная дзяржава, рэспубліка, манархія, унітарная і федэратыўная дзяржава;

умеюць:

тлумачыць ролю сацыяльна-эканамічнай геаграфіі ў жыцці чалавека і грамадства;

паказваць на палітычнай карце свету тры найбуйнейшыя па плошчы дзяржавы (Расія, Канада, Кітай), называць і паказваць іх сталіцы; тры найбуйнейшыя краіны па колькасці насельніцтва;

абазначаць на контурнай карце тры найбуйнейшыя па плошчы і колькасці насельніцтва дзяржавы свету, іх сталіцы і межы;

характарызаваць розныя тыпы дзяржаў і залежныя тэрыторыі;

прыводзіць прыклады колькасных і якасных змяненняў на палітычнай карце свету;

выкарыстоўваць разнастайныя крыніцы геаграфічнай інфармацыі для параўнання розных краін і тэрыторый.

### Тэма 2. Насельніцтва свету (5 гадзін)

Колькасць насельніцтва свету і яго дынаміка. Нараджальнасць, смяротнасць, натуральны прырост (змяншэнне) і міграцыі насельніцтва.

Размяшчэнне насельніцтва. Шчыльнасць насельніцтва. Рассяленне насельніцтва і яго формы. Урбанізацыя.

Асноўныя расы і іх геаграфія. Геаграфія народаў свету. Геаграфія рэлігій свету.

Геаграфія матэрыяльнай і духоўнай культуры. Аб'екты Сусветнай спадчыны ААН па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (далей – ЮНЕСКА).

Практычная работа

1*. Рашэнне задач на вызначэнне змянення колькасці насельніцтва з улікам нараджальнасці, смяротнасці і міграцыі насельніцтва.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
## ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

колькасць насельніцтва свету і Рэспублікі Беларусь; дынаміку колькасці насельніцтва свету; фактары, якія вызначаюць змяненне колькасці і шчыльнасці насельніцтва; расавы склад насельніцтва і яго геаграфію; сусветныя рэлігіі і арэалы распаўсюджвання хрысціянства, ісламу і будызму;

на ўзроўні ўяўлення пра: этнічны склад насельніцтва, нацыянальныя рэлігіі, аб’екты Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА;

асноўныя паняцці: дэмаграфія, натуральны прырост, міграцыя насельніцтва, шчыльнасць насельніцтва, урбанізацыя, агламерацыя, раса;

умеюць:

характарызаваць дынаміку колькасці насельніцтва свету;

вызначаць асаблівасці размяшчэння насельніцтва;

паказваць на карце арэалы з найбольшай і найменшай шчыльнасцю насельніцтва ў свеце, арэалы распаўсюджвання асноўных сусветных рэлігій;

аналізаваць сярэднія паказчыкі натуральнага прыросту насельніцтва рэгіёнаў свету, параўноўваць іх і тлумачыць адрозненні;

аналізаваць фактары натуральнага руху насельніцтва і наступствы міграцый;

характарызаваць расавы, этнічны, канфесійны склад насельніцтва;

характарызаваць асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры;

знаходзіць і паказваць на карце аб’екты Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА;

ажыццяўляць разлікі па вызначэнні змянення колькасці насельніцтва.

### Тэма 3. Прыродныя рэсурсы і іх роля у жыцці чалавека (2 гадзіны)

Прыродныя рэсурсы. Класіфікацыя прыродных рэсурсаў. Зямельныя рэсурсы. Водныя і кліматычныя рэсурсы.

Мінеральныя рэсурсы. Размяшчэнне радовішчаў асноўных відаў мінеральных рэсурсаў (нафты, прыроднага газу, вугалю, жалезных, алюмініевых і медных руд) і іх узаемасувязь з тэктанічнай будовай Зямлі.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
## ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

класіфікацыю прыродных рэсурсаў; распалажэнне радовішчаў асноўных відаў мінеральных рэсурсаў;

на ўзроўні ўяўлення: пра вычарпальныя і невычарпальныя, аднаўляльныя і неаднаўляльныя прыродныя рэсурсы;

асноўныя паняцці: прыродныя рэсурсы, мінеральныя рэсурсы, зямельныя рэсурсы, водныя рэсурсы, біялагічныя рэсурсы, кліматычныя рэсурсы;

умеюць:

класіфікаваць прыродныя рэсурсы свету, характарызаваць прыродныя рэсурсы рэгіёнаў;

выяўляць прычынна-выніковыя сувязі паміж распалажэннем радовішчаў асноўных відаў мінеральных рэсурсаў і тэктанічнай будовай і рэльефам Зямлі;

характарызаваць распалажэнне асноўных відаў прыродных рэсурсаў;

паказваць на карце асноўныя мінеральна-сыравінныя раёны і найбуйнейшыя радовішчы: нафтагазаносныя правінцыі – Персідскага заліва, Заходне-Сібірскую, Мексіканскую, Заходне-Афрыканскую, Паўночнага мора; басейны і радовішчы: жалезных руд – Хамерслі (Аўстралія), Каражас, Урукум (Бразілія), вугалю – Тунгускі (Расія), Апалацскі (Злучаныя Штаты Амерыкі (далей – ЗША).

Тэма 4. Агульная характарыстыка гаспадаркі (5 гадзін)

Гаспадарка і яе структура. Сферы, галіны і віды гаспадарчай дзейнасці. Формы тэрытарыяльнай арганізацыі гаспадаркі.

Фактары размяшчэння гаспадаркі: сыравінны, энергетычны, працоўны, навукова-тэхнічны, спажывецкі, транспартны, экалагічны.

Сусветны рынак, міжнародны гандаль і сусветная гаспадарка. Гаспадарчая спецыялізацыя. Тэрытарыяльны падзел працы і яе вынікі.

Паказчыкі ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця краін. Валавы ўнутраны прадукт (далей – ВУП). Адрозненні краін па ўзроўні эканамічнага развіцця. Індэкс чалавечага развіцця (далей – ІЧР). Групы краін па ўзроўні ІЧР.

Практычная работа

2. Пабудова дыяграм структуры ВУП паводле статыстычных даных 2–3 краін свету, іх параўнальны аналіз.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

асноўныя галіны і віды гаспадарчай дзейнасці; фактары размяшчэння гаспадаркі; аб тэрытарыяльным падзеле працы;

на ўзроўні ўяўлення пра: сусветную гаспадарку; формы тэрытарыяльнай арганізацыі гаспадаркі; сусветны рынак, міжнародны гандаль; групы краін па ўзроўні эканамічнага развіцця і велічыні ІЧР;

асноўныя паняцці: гаспадарка, від эканамічнай дзейнасці, галіна гаспадаркі, сфера вытворчасці, сфера паслуг, спецыялізацыя; тэрытарыяльны падзел працы, ВУП, ІЧР;

умеюць:

характарызаваць галіновую структуру гаспадаркі;

адрозніваць формы тэрытарыяльнай арганізацыі гаспадаркі;

вызначаць напрамкі міжнароднага гандлю;

тлумачыць вынікі тэрытарыяльнага падзелу працы; асаблівасці галін сферы вытворчасці і сферы паслуг;

выкарыстоўваць веды аб фактарах размяшчэння вытворчасці і галінах гаспадарчай спецыялізацыі для аналізу размяшчэння вытворчасці;

будаваць і аналізаваць графікі і структурныя дыяграмы паводле статыстычных даных.

### Тэма 5. Сельская гаспадарка (4 гадзіны)

Сельская гаспадарка, яе галіновая структура. Узаемасувязь сельскагаспадарчай дзейнасці з прыроднымі ўмовамі і рэсурсамі.

Раслінаводства і яго структура. Геаграфія вырошчвання асноўных збожжавых культур (рысу, кукурузы і пшаніцы).

Асноўныя тэхнічныя культуры (валакністыя, маслінавыя, цукраносныя, танізуючыя) і геаграфія іх вырошчвання. Геаграфія вырошчвання бульбы.

Жывёлагадоўля і яго структура. Геаграфія жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, птушкагадоўлі і авечкагадоўлі.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
## ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

галіновую структуру сельскай гаспадаркі, раслінаводства і жывёлагадоўлі;

на ўзроўні ўяўлення пра: ўплыў прыродных умоў на развіццё сельскай гаспадаркі; геаграфію вырошчвання сельскагаспадарчых культур; геаграфію жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, птушкагадоўлі і авечкагадоўлі;

асноўныя паняцці: раслінаводства, жывёлагадоўля.

умеюць:

характарызаваць склад і асноўныя рысы размяшчэння сусветнага раслінаводства і жывёлагадоўлі;

паказваць на карце тры краіны свету, якія лідзіруюць: па валавым зборы пшаніцы, рысу, кукурузы; пагалоўі буйной рагатай жывёлы, свіней, авечак;

тлумачыць уплыў прыродных умоў на размяшчэнне сельскай гаспадаркі;

характарызаваць геаграфічныя асаблівасці раслінаводства і жывёлагадоўлі.

Тэма 6. Прамысловасць (8 гадзін)

Здабыўная прамысловасць. Спосабы здабычы карысных выкапняў. Геаграфія здабычы найважнейшых энергетычных (нафта, газ, вугаль, уран), рудных (руды чорных і каляровых (алюміній, медзь) металаў) і нярудных (калійныя солі, фасфарыты) карысных выкапняў.

Энергетыка. Вытворчасць электраэнергіі. Тыпы электрастанцый: цеплавыя электрастанцыі (далей – ЦЭС), гідраэлектрастанцыі (далей – ГЭС), атамныя электрастанцыі (далей – АЭС) і альтэрнатыўная энергетыка. Геаграфія цеплавой і атамнай электраэнергетыкі, гідраэлектраэнергетыкі.

Апрацоўчая прамысловасць. Металургія: сыравіна і тэхналагічныя асаблівасці вытворчасці чорных і каляровых металаў. Фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці.

Машынабудаванне: сыравіна і тэхналагічныя асаблівасці вытворчасці, фактары размяшчэння. Геаграфія аўтамабілебудавання, суднабудавання, станкабудавання, электроннай прамысловасці.

Хімічная прамысловасць. Сыравіна і фактары размяшчэння вытворчасці. Вытворчасць мінеральных угнаенняў. Вытворчасць гумавых і пластмасавых вырабаў.

Лясная гаспадарка і лясная прамысловасць. Цэлюлозна-папяровая вытворчасць. Сыравіна і фактары размяшчэння вытворчасці.

Лёгкая і харчовая прамысловасць. Геаграфія тэкстыльнай і швейнай прамысловасці. Вытворчасць скуры і абутку. Геаграфія харчовай прамысловасці.

Практычная работа

3*. Складанне эканоміка-геаграфічнай характарыстыкі галіны прамысловасці (на выбар) згодна з тыпавым планам.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

структуру прамысловасці, галін і відаў дзейнасці, якія адносяцца да здабыўной і апрацоўчай прамысловасці;

на ўзроўні ўяўлення пра: асноўныя тэхналагічныя працэсы вытворчасці, вытворчасць электраэнергіі, тыпы электрастанцый (ЦЭС, ГЭС, АЭС) і альтэрнатыўную энергетыку;

асноўныя паняцці: здабыўная прамысловасць, апрацоўчая прамысловасць, энергетыка, металургія, машынабудаванне, хімічная прамысловасць, лясная прамысловасць, лёгкая прамысловасць, харчовая прамысловасць;

умеюць:

паказваць на карце краіны, якія лідзіруюць па здабычы жалезных руд, медных руд, алюмініевых руд, нафты, прыроднага газу, вугалю; вытворчасці чыгуну, сталі, алюмінію, медзі, аўтамабіляў, мінеральных угнаенняў (азотных, фосфарных, калійных);

паказваць на карце асноўныя цэнтры прамысловасці свету, найбуйнейшыя ЦЭС, ГЭС, АЭС;

характарызаваць асноўныя галіны прамысловасці;

параўноўваць асаблівасці развіцця галін прамысловасці ў эканамічна развітых краінах і краінах, якія развіваюцца;

выяўляць прычынна-выніковыя сувязі ў размяшчэнні галоўных вытворчасцей металургіі і машынабудавання;

тлумачыць значэнне галін прамысловасці ў жыцці чалавека.

## Тэма 7. Сфера паслуг (4 гадзіны)

Структура сферы паслуг. Асаблівасці развіцця і размяшчэння. Роля сферы паслуг у сучаснай гаспадарцы.

Транспартная сістэма. Віды транспарту (наземны, водны, паветраны). Асноўныя віды транспарту: чыгуначны, аўтамабільны, трубаправодны, марскі, рачны, авіяцыйны.

Геаграфія турызму. Геаграфія гандлю таварамі і паслугамі.

Практычная работа

4. Складанне картасхемы распалажэння цэнтраў міжнароднага турызму і вызначэнне фактараў іх распалажэння.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

структуру сферы паслуг; асаблівасці геаграфіі транспарту; геаграфію турызму, гандлю таварамі і паслугамі;

на ўзроўні ўяўлення пра: роль чыгуначнага, аўтамабільнага, марскога, рачнога, авіяцыйнага і трубаправоднага транспарту ў развіцці гаспадаркі;

асноўныя паняцці: транспарт, турызм;

умеюць:

характарызаваць асаблівасці развіцця і ролю сферы паслуг у сучаснай гаспадарцы; турысцкага патэнцыялу і яго выкарыстання;

характарызаваць развіццё сферы паслуг у краінах з розным узроўнем эканомікі;

характарызаваць асноўныя віды транспарту;

тлумачыць асаблівасці развіцця розных відаў транспарту;

паказваць на карце краіны, якія маюць самыя працяглыя чыгункі і найбольшую гушчыню чыгуначнай сеткі;

паказваць на карце краіны, якія лідзіруюсь у развіцці міжнароднага турызму.

## РЭГІЯНАЛЬНЫ АГЛЯД СВЕТУ (33 гадзіны)

### Тэма 8. Еўропа (9 гадзін)

Сацыяльна-эканамічныя рэгіёны Еўропы. Краіны Паўночнай Еўропы. Велікабрытанія. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Насельніцтва, дэмаграфічныя асаблівасці, урбанізацыя. Геаграфія машынабудавання і хімічнай прамысловасці. Сфера паслуг. Транспарт. Марскія парты. Еўратунэль. Сельская гаспадарка. Развіццё турызму.

Фінляндыя, Швецыя, Данія, Ісландыя, Нарвегія. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Насельніцтва, дэмаграфічныя асаблівасці, урбанізацыя. Уплыў прыродна-сыравіннай базы на структуру гаспадаркі. Прыродна-рэсурсны патэнцыял мораў. Нафтаздабыча. Рыбалоўства. Развіццё турызму.

Літва, Латвія, Эстонія. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Роля Балтыйскага мора ў гаспадарчай дзейнасці насельніцтва. Насельніцтва, дэмаграфічныя асаблівасці, урбанізацыя. Геаграфія апрацоўчай прамысловасці і гаспадарчая спецыялізацыя краін.

Краіны Заходняй Еўропы. Германія. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Насельніцтва, дэмаграфічныя асаблівасці, урбанізацыя. Геаграфія сферы паслуг, прамысловасці і іх месца ў эканоміцы краіны. Сельская гаспадарка Германіі. Турызм.

Францыя. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Насельніцтва, дэмаграфічныя асаблівасці, урбанізацыя.

Геаграфія машынабудавання і хімічнай прамысловасці. Сельская гаспадарка Францыі. Геаграфія і структура сферы паслуг Францыі. Транспарт. Марскія парты. Развіццё турызму.

Краіны Паўднёвай Еўропы. Італія.Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Насельніцтва, дэмаграфічныя асаблівасці, урбанізацыя. Міграцыі насельніцтва. Спецыялізацыя гаспадаркі краіны. Геаграфія машынабудавання і хімічнай прамысловасці. Сельская гаспадарка. Праблема развіцця Поўначы і Поўдня Італіі. Развіццё турызму.

Краіны Усходняй Еўропы. Польшча. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Насельніцтва, дэмаграфічныя асаблівасці, урбанізацыя. Здабыча вугалю, электраэнергетыка. Геаграфія каляровай і чорнай металургіі, хімічнай прамысловасці (мінеральных угнаенняў і фармацэўтычных тавараў), машынабудавання, лёгкай прамысловасці. Турызм.

Украіна. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Насельніцтва, дэмаграфічныя асаблівасці, урбанізацыя. Геаграфія здабычы вугалю і электраэнергетыкі, металургіі, машынабудавання, хімічнай прамысловасці, вытворчасці харчовых прадуктаў. Спецыялізацыя раслінаводства і жывёлагадоўлі. Транспарт. Марскія парты. Турызм.

Практычная работа

5*. Складанне характарыстыкі эканоміка-геаграфічнага становішча Вялікабрытаніі згодна з тыпавым планам.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

колькасць насельніцтва краін – суседзяў Рэспублікі Беларусь; рэгіёны Еўропы; асаблівасці развіцця гаспадаркі рэгіёнаў Еўропы;

на ўзроўні ўяўлення: склад рэгіёнаў Еўропы, пра праблемы сацыяльна-эканамічнага развіцця Поўначы і Поўдня Італіі;

асноўныя паняцці: эканоміка-геаграфічнае становішча, кабатажныя перавозкі;

умеюць:

паказваць на карце дзяржавы і іх сталіцы, эканамічныя цэнтры: Вялікабрытанію (Лондан), Нарвегію (Осла), Швецыю (Стакгольм), Данію (Капенгаген), Фінляндыю (Хельсінкі), Літву (Вільнюс), Латвію (Рыгу), Эстонію (Талін) , Германію (Берлін), Францыю (Парыж), Партугалію

(Лісабон), Іспанію (Мадрыд), Італію (Рым), Грэцыю (Афіны), Польшчу (Варшаву), Украіну (Кіеў);

паказваць на карце «прамысловы трохвугольнік» Італіі (Турын – Генуя – Мілан); раёны нафта- і газаздабычы – Паўночнае мора; найбуйнейшыя вугальныя басейны;

характарызаваць дэмаграфічныя працэсы, рассяленне і гаспадарку краін рэгіёна;

тлумачыць асаблівасці эканоміка-геаграфічнага становішча краін;

параўноўваць структуру ВУП краін рэгіёна;

працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі і складаць характарыстыку галіновай структуры гаспадаркі краін.

## Тэма 9. Расійская Федэрацыя (5 гадзін)

Расія на палітычнай карце свету. Эканоміка-геаграфічнае становішча. Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне. Геаграфічныя перадумовы для развіцця міждзяржаўных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй.

Насельніцтва. Дэмаграфічныя асаблівасці. Дынаміка колькасці і натуральнага прыросту насельніцтва. Полаўзроставая структура насельніцтва. Нацыянальны і рэлігійны склад насельніцтва. Размяшчэнне насельніцтва.

Геаграфія прамысловасці. Прыродна-рэсурсны патэнцыял. Геаграфія вядучых галін здабыўной і апрацоўчай прамысловасці. Геаграфія вытворчасці электраэнергіі.

Геаграфія сельскай гаспадаркі: асаблівасці развіцця і размяшчэння. Занальная спецыялізацыя.

Сфера паслуг. Транспарт. Асаблівасці развіцця і размяшчэння асноўных відаў транспарту.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

дэмаграфічныя асаблівасці Расіі;

на ўзроўні ўяўлення пра: асаблівасці дэмаграфічных працэсаў, размяшчэнне і спецыялізацыю гаспадаркі Расіі;

асноўныя паняцці: замяшчальная міграцыя, занальная спецыялізацыя сельскай гаспадаркі;

умеюць:

паказваць на карце раёны нафта- і газаздабычы: нафтагазаносныя правінцыі – Заходне-Сібірскую, Волга-Уральскую, Цімана-Пячорскую;

вугальныя басейны – Канска-Ачынскі буравугальны, Пячорскі (Пячбас); металургічныя базы – Уральскую, Цэнтральную, Сібірскую; цэнтр каляровай металургіі – Нарыльск; машынабудаўнічыя цэнтры: аўтамабілебудавання – Ніжні Ноўгарад, Тальяці, Набярэжныя Чаўны, авіяцыйнай прамысловасці – Казань; цэнтры хімічнай і лясной прамысловасці – Салікамск, Беразнікі, Омск, Архангельск, Брацк; транспарт – транссібірскую чыгуначную магістраль; парты – Наварасійск, Калінінград, Мурманск;

характарызаваць дэмаграфічныя працэсы;

характарызаваць эканоміка-геаграфічнае становішча, уплыў прыродных умоў і рэсурсаў на развіццё гаспадаркі, прычыны ўнутраных сацыяльна-эканамічных адрозненняў, напрамкі развіцця гаспадаркі Расіі;

параўноўваць прыродна-рэсурсны патэнцыял і структуру гаспадаркі еўрапейскай і азіяцкай частак Расіі;

працаваць з рознымі крыніцамі геаграфічнай інфармацыі для параўнання еўрапейскай і азіяцкай частак Расіі.

### Тэма 10. Азія (5 гадзін)

Сацыяльна-эканамічныя рэгіёны Азіі. Краіны Усходняй Азіі. Японія. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Дэмаграфічныя асаблівасці. Рассяленне і ўрбанізацыя. Спецыялізацыя гаспадаркі. Геаграфія сферы паслуг і прамысловай вытворчасці. Геаграфія сельскай гаспадаркі. Развіццё аквакультуры (марыкультура). Ціхаакіянскі прамысловы пояс.

Кітай. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Дэмаграфічныя асаблівасці. Прамысловасць і сельская гаспадарка. Нераўнамернасць тэрытарыяльнага развіцця. Свабодныя эканамічныя зоны.

Краіны Паўднёвай Азіі. Індыя. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Дэмаграфічныя асаблівасці. Шматнацыянальны склад насельніцтва. Рэлігійны склад. Урбанізацыя і сацыяльныя праблемы агламерацый. Асаблівасці развіцця і размяшчэння прамысловасці. Геаграфія сельскай гаспадаркі.

Краіны Цэнтральнай Азіі: Казахстан, Узбекістан, Таджыкістан, Туркменістан, Кыргызстан. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Дэмаграфічныя асаблівасці. Спецыялізацыя гаспадаркі.

Краіны Заходняй Азіі. Грузія, Арменія, Азербайджан. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Дэмаграфічныя асаблівасці. Спецыялізацыя гаспадаркі краін рэгіёна.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

рэгіёны Азіі; дэмаграфічныя асаблівасці краін Азіі; размяшчэнне і спецыялізацыю гаспадаркі краін Азіяцкага рэгіёна;

на ўзроўні ўяўлення: склад рэгіёнаў Азіяцкага рэгіёна; пра асаблівасці дэмаграфічных працэсаў;

асноўныя паняцці: аквакультура, дэмаграфічная палітыка, свабодная эканамічная зона;

умеюць:

паказваць на карце дзяржавы і іх сталіцы, найбуйнейшыя эканамічныя цэнтры – Японію (Токіа), Кітай (Пекін), Індыю (Дэлі, Мумбаі), Казахстан (Астану), Узбекістан (Ташкент), Туркменістан (Ашхабад), Таджыкістан (Душанбэ), Кыргызстан (Бішкек), Грузію (Тбілісі), Арменію (Ерэван), Азербайджан (Баку);

характарызаваць асаблівасці насельніцтва і гаспадаркі краін Азіі;

тлумачыць дэмаграфічныя асаблівасці краін рэгіёна;

характарызаваць сацыяльна-эканамічныя асаблівасці краін рэгіёна.

### Тэма 11. Паўночная і Цэнтральная Амерыка (5 гадзін)

Сацыяльна-эканамічныя рэгіёны Амерыкі. Паўночная і Цэнтральная Амерыка. Палітычная карта. Дэмаграфічныя асаблівасці і рассяленне насельніцтва. Міграцыі. Расава-этнічны і рэлігійны склад насельніцтва.

Краіны Паўночнай Амерыкі. ЗША. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Геаграфія насельніцтва. Геаграфія сферы паслуг. Асаблівасці і структура прамысловасці краіны. Геаграфія і спецыялізацыя сельскай гаспадаркі краіны. Транспарт. Знешнія эканамічныя сувязі ЗША.

Канада. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Насельніцтва. Геаграфія здабыўной прамысловасці, металургіі і машынабудавання. Апрацоўка драўніны, цэлюлозна-папяровая прамысловасць, хімічная прамысловасць. Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі. Геаграфія транспарту краіны.

Краіны Цэнтральнай Амерыкі. Мексіка. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Геаграфія насельніцтва. Здабыўная прамысловасць і геаграфія апрацоўчай прамысловасці. Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі краіны.

Практычная работа

6. Складанне параўнальнай эканоміка-геаграфічнай характарыстыкі

ЗША і Канады згодна з тыпавым планам.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

асаблівасці геаграфіі насельніцтва краін Паўночнай і Цэнтральнай Амерыкі; спецыялізацыю гаспадаркі ЗША, Канады, Мексікі;

на ўзроўні ўяўлення пра: расава-этнічны і рэлігійны склад насельніцтва;

асноўны тэрмін: мегалаполіс;

умеюць:

паказваць на карце дзяржавы і іх сталіцы, найбуйнейшыя эканамічныя цэнтры – ЗША (Вашынгтон, Нью-Ёрк, Лос-Анджэлес, Сан-Францыска), Канаду (Атава, Таронта, Манрэаль), Мексіку (Мехіка);

апісваць асаблівасці эканомікі краін;

характарызаваць асаблівасці насельніцтва і яго гаспадарчай дзейнасці ў ЗША, Канадзе, Мексіцы;

тлумачыць уплыў фактараў размяшчэння вытворчасці на развіццё краін рэгіёна;

складаць параўнальную эканоміка-геаграфічную характарыстыку краін;

працаваць з рознымі крыніцамі геаграфічнай інфармацыі і выкарыстоўваць план для параўнання і эканоміка-геаграфічнай характарыстыкі ЗША і Канады.

## Тэма 12. Паўднёвая Амерыка (4 гадзіны)

Палітычная карта Паўднёвай Амерыкі. Насельніцтва. Расы і расавыя групы. Этнічны і рэлігійны склад. Размяшчэнне насельніцтва. Гарады і агламерацыі. Праблема несапраўднай урбанізацыі.

Агульная характарыстыка гаспадаркі краін Паўднёвай Амерыкі. Геаграфія прамысловасці. Геаграфія сельскай гаспадаркі. Транспарт. Экалагічныя праблемы гаспадарчага асваення рэгіёна.

Бразілія. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Геаграфія прамысловасці. Роля здабыўной прамысловасці ў эканоміцы. Геаграфія сельскай гаспадаркі. Сфера паслуг. Знешнія эканамічныя сувязі.

Практычная работа

7*. Складанне характарыстыкі прыродных рэсурсаў Бразіліі як фактару яе эканамічнага развіцця.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення: структуру валавога ўнутранага прадукту краін Паўднёвай Амерыкі;

дэмаграфічныя асаблівасці Паўднёвай Амерыкі; спецыялізацыю гаспадаркі Бразіліі;

асноўны тэрмін: несапраўдная ўрбанізацыя;

умеюць:

паказваць на карце дзяржавы і іх сталіцы, найбуйнейшыя эканамічныя цэнтры – Бразілію (Бразілію), Буэнас-Айрэс, Сан-Паўлу, Рыа-дэ-Жанейра, Сант’яга, Багату, Ліму;

апісваць гаспадарчую дзейнасць краін;

характарызаваць асаблівасці насельніцтва і гаспадаркі Бразіліі;

складаць эканоміка-геаграфічную характарыстыку краіны;

працаваць з рознымі крыніцамі геаграфічнай інфармацыі для складання характарыстыкі прыродных рэсурсаў Бразіліі.

### Тэма 13. Афрыка (3 гадзіны)

Палітычная карта Афрыкі. Геапалітычныя праблемы. Дэмаграфічныя асаблівасці. Этнічны і рэлігійны склад насельніцтва.

Агульная характарыстыка гаспадаркі Афрыкі. Геаграфія сферы паслуг і прамысловасці. Асаблівасці развіцця і геаграфіі сельскай гаспадаркі.

Эканоміка-геаграфічная характарыстыка краін рэгіёна: Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка (далей – ПАР), Егіпет.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця краін Афрыкі; галіны спецыялізацыі прамысловасці і сельскай гаспадаркі Афрыкі;

на ўзроўні ўяўлення пра: дэмаграфічнае развіццё, этнічны і рэлігійны склад насельніцтва;

асноўнае паняцце: монакультурная спецыялізацыя;

умеюць:

паказваць на карце дзяржавы і іх сталіцы, найбуйнейшыя эканамічныя цэнтры – Егіпет (Каір), ПАР (Прэторыю), Александрыю, Кейптаўн, Іаганэсбург, Нігерыю, Алжыр;

апісваць асаблівасці палітычнай карты, насельніцтва і яго гаспадарчай дзейнасці;

тлумачыць дэмаграфічныя тэндэнцыі; асаблівасці нераўнамернага размяшчэння і структуры насельніцтва, гаспадаркі краін;

характарызаваць асаблівасці насельніцтва і гаспадаркі Егіпта, ПАР.

### Тэма 14. Аўстралія і Акіянія (2 гадзіны)

Аўстралійскі Саюз. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Геаграфія насельніцтва і дэмаграфічныя асаблівасці. Расавы, этнічны і рэлігійны склад насельніцтва. Прамысловасць. Сельская гаспадарка.

Акіянія. Палітычная карта. Гаспадарчая дзейнасць насельніцтва. Новая Зеландыя.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення пра: найбуйнейшыя гарады; расавы, этнічны і рэлігійны склад насельніцтва;

народы, якія засяляюць мацярык і групы астравоў Акіяніі; пра гаспадарчую дзейнасць насельніцтва;

умеюць:

паказваць на карце найбуйнейшыя эканамічныя цэнтры – Аўстралійскі Саюз (Канберу), Новую Зеландыю (Велінгтон), Сіднэй, Мельбурн;

апісваць асаблівасці гаспадарчай дзейнасці;

характарызаваць асаблівасці насельніцтва, сацыяльна-эканамічнага развіцця Аўстралійскага Саюза і краін Акіяніі.

## ГЛАВА 5
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў IX КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

(1,5 гадзіны ў тыдзень; усяго 51 гадзіна, з іх 1 гадзіна – рэзервовы час)

### ГЕАГРАФІЯ БЕЛАРУСІ (50 гадзін)

### Тэма 1. Геаграфічнае становішча і даследаванне тэрыторыі Беларусі (4 гадзіны)

Месца геаграфіі Беларусі ў развіцці геаграфічных ведаў аб Зямлі.

Фізіка- і эканоміка-геаграфічнае становішча Рэспублікі Беларусь. Велічыня тэрыторыі. Дзяржаўныя межы.

Фарміраванне дзяржаўнай тэрыторыі Беларусі. Сучаснае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне краіны.

Геаграфічныя даследаванні тэрыторыі Беларусі да 1918 г. і ў даваенны час. Працы А. А. Смоліча. Сучасныя даследаванні.

Геаграфічныя назвы Беларусі. Групоўка назваў геаграфічных аб’ектаў па паходжанні.

Практычная работа

1. Характарыстыка геаграфічнага становішча Рэспублікі Беларусь.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

плошчу, працягласць тэрыторыі Беларусі з поўначы на поўдзень і з захаду на ўсход;

на ўзроўні ўяўлення пра: асаблівасці геаграфічнага становішча Беларусі, асноўныя этапы развіцця геаграфіі Беларусі, найважнейшыя напрамкі геаграфічных даследаванняў на сучасным этапе; вучоных – даследчыкаў краіны; паходжанне назваў геаграфічных аб’ектаў Беларусі;

асноўныя паняцці: фізіка-геаграфічнае становішча, геаграфічны цэнтр, тапаніміка;

умеюць:

паказваць на карце краіны, з якімі мяжуе Беларусь; адміністрацыйныя рэгіёны Беларусі; раёны экспедыцыйных даследаванняў;

працаваць з геаграфічнай картай для вызначэння асаблівасцей геаграфічнага становішча Рэспублікі Беларусь;

характарызаваць асаблівасці дзяржаўных меж з суседнімі краінамі; уклад у геаграфічныя даследаванні вядучых вучоных Беларусі;

ацэньваць значэнне і магчымасці выкарыстання геаграфічнага становішча Беларусі для сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

### Тэма 2. Прыродныя ўмовы і рэсурсы Беларусі (9 гадзін)

Геалагічная будова. Размяшчэнне тэрыторыі Беларусі ў межах Усходне-Еўрапейскай платформы. Фарміраванне крышталічнага фундамента. Найбуйнейшыя тэктанічныя структуры. Геахраналагічная шкала. Фарміраванне платформавага чахла ў дачацвярцічны час. Фарміраванне тэрыторыі ў чацвярцічным перыядзе. Мацерыковыя зледзяненні і міжледавікоўі.

Карысныя выкапні. Гаручыя карысныя выкапні. Металічныя карысныя выкапні. Неметалічныя карысныя выкапні. Вадкія карысныя выкапні. Падземныя воды.

Рэльеф. Фактары фарміравання рэльефу. Генетычныя тыпы рэльефу. Асноўныя ўзвышшы, раўніны і нізіны, іх размяшчэнне і характарыстыка. Уплыў дзейнасці чалавека на змяненне рэльефу.

Клімат і кліматычныя рэсурсы. Агульныя рысы клімату Беларусі. Сонечная радыяцыя. Паветраныя масы і атмасферная цыркуляцыя. Цеплавы рэжым. Вільготнасць паветра і ападкі. Сучасныя змены клімату.

Паверхневыя воды. Гідраграфічная сетка. Басейны галоўных рэк. Жыўленне рэк і асаблівасці іх гідралагічнага рэжыму. Каналы і водныя шляхі. Азёры, вадасховішчы і сажалкі, іх размяшчэнне. Тыпы азёрных катлавін Беларусі па паходжанні. Балоты і іх тыпы. Гаспадарчае значэнне паверхневых вод.

Глебы. Фактары і працэсы глебаўтварэння. Асноўныя тыпы глеб, іх распаўсюджванне. Зямельныя рэсурсы і іх выкарыстанне. Меліярацыя глеб.

Расліннасць. Сучасны склад флоры. Асноўныя тыпы расліннасці. Лясная расліннасць. Тыпы лясоў. Лясістасць тэрыторыі, яе змяненне. Лугавая, балотная расліннасць, расліннасць вадаёмаў. Гаспадарчае выкарыстанне і ахова расліннага свету.

Жывёльны свет. Сучасны склад фаўны. Жывёльны свет лясоў, палёў і лугоў, балот, вадаёмаў і іх узбярэжжаў, паселішчаў чалавека. Гаспадарчае выкарыстанне і ахова жывёльнага свету.

Практычныя работы

2. Выяўленне ўзаемасувязі паміж геалагічнай будовай, карыснымі выкапнямі і рэльефам.

3. Пабудова і аналіз кліматычных дыяграм, графікаў, ружы вятроў для метэаралагічнай станцыі сваёй мясцовасці.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення пра: асаблівасці тэктанічнай і геалагічнай будовы Беларусі; геахраналагічную шкалу, генетычныя тыпы чацвярцічных адкладаў і рэльефу; сінекліз; агульныя рысы клімату; прамую, рассеяную радыяцыю; кліматычныя рэсурсы, вегетацыйны перыяд; тыпы жыўлення рэк; каналы; асноўныя тыпы глеб, фактары глебаўтварэння; склад флоры, асноўныя тыпы расліннасці і асаблівасці іх размяшчэння; поймавыя і пазапоймавыя лугі; верхавыя, нізінныя і пераходныя балоты; склад фаўны,

жывёльны свет лясоў, палёў і лугоў, балот, вадаёмаў і ўзбярэжжаў, паселішчаў чалавека.

асноўныя паняцці: антэкліза, прагіб, седлавіна, упадзіна, тэктанічны разлом, міжледавікоўе, марэнныя адклады, сумарная сонечная радыяцыя, гушчыня рачной сеткі, гідралагічны рэжым, вадасховішча, працэс глебаўтварэння, тып расліннасці, лясістасць;

умеюць:

паказваць на карце тэктанічныя структуры – Украінскі шчыт, Беларускую антэклізу, Варонежскую антэклізу, Аршанскую ўпадзіну, Прыпяцкі прагін, Жлобінскую седлавіну, Палескую седлавіну, Мікашэвіцка-Жыткавіцкі выступ; радовішчы карысных выкапняў: нафты – Рэчыцкае, Асташкавіцкае; калійных солей – Старобінскае, Петрыкаўскае; каменнай солі – Мазырскае; даламітаў – Руба; грады і ўзвышшы – Беларускую граду, Браслаўскія грады, Ашмянскае, Віцебскае, Мінскае, Навагрудскае ўзвышшы, Мазырскую граду; раўніны: Цэнтральнабярэзінскую, Нарачана-Вілейскую, Лідскую; нізіны – Палескую, Полацкую; рэкі – Дняпро, Бярэзіну, Заходнюю Дзвіну, Заходні Буг, Нёман, Прыпяць, Вілію; азёры – Нарач, Дрывяты, Асвейскае, Чырвонае, Доўгае; вадасховішчы – Вілейскае, Заслаўскае; каналы – Дняпроўска-Бугскі, Аўгустоўскі;

характарызаваць генетычныя тыпы рэльефу; размеркаванне кліматычных паказчыкаў; тыпы азёрных катлавін; структуру зямельных рэсурсаў; размяшчэнне і гаспадарчае значэнне асноўных тыпаў расліннасці;

тлумачыць залежнасць фарміравання платформавага чахла ад тэктанічнай будовы; сувязь карысных выкапняў з геалагічнай і тэктанічнай будовай; залежнасць гідралагічных паказчыкаў ад клімату і рэльефу;

разлічваць гадавую амплітуду тэмператур; будаваць кліматычныя дыяграмы, графікі ходу тэмпературы, ружы вятроў.

### Тэма 3. Геаграфічныя ландшафты.
### Геаэкалагічныя праблемы (4 гадзіны)

Геаграфічныя ландшафты. Распаўсюджванне прыродных ландшафтаў. Характарыстыка ландшафтаў. Антрапагенныя ландшафты.

Рэкрэацыйныя рэсурсы. Зоны адпачынку і курорты. Турысцкія комплексы і маршруты, аграсядзібы. Перспектывы выкарыстання рэкрэацыйных рэсурсаў.

Геаэкалагічныя праблемы Беларусі. Забруджванне тэрыторыі радыенуклідамі ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Праблемы Палесся, Салігорскага горнапрамысловага раёна. Праблемы забруджвання

прыродных кампанентаў (атмасфернага паветра, паверхневых і падземных вод, глеб) у выніку гаспадарчай дзейнасці.

Прыродаахоўныя тэрыторыі. Запаведнікі, нацыянальныя паркі, заказнікі і помнікі прыроды рэспубліканскага і мясцовага значэння.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення пра: асаблівасці ландшафтаў, гаспадарчае выкарыстанне ландшафтаў; тыпы прыродаахоўных тэрыторый і аб’ектаў; асноўныя геаэкалагічныя праблемы; турысцкія маршруты;

асноўнае паняцце: ландшафт;

умеюць:

паказваць на карце: запаведнік – Бярэзінскі біясферны; нацыянальныя паркі – Белавежскую пушчу, Браслаўскія азёры, Нарачанскі, Прыпяцкі; заказнікі – Налібоцкі, Ельню;

характарызаваць геаэкалагічныя праблемы;

тлумачыць перспектывы пашырэння сеткі прыродаахоўных аб’ектаў, узаемасувязі прыродных кампанентаў;

характарызаваць турысцка-рэкрэацыйныя рэсурсы сваёй мясцовасці.

## Тэма 4. Прыроднае раяніраванне Беларусі (4 гадзіны)

Сутнасць прыроднага раяніравання і яго віды. Фізіка-геаграфічнае раяніраванне Беларусі.

Беларуская Паазерская правінцыя. Геаграфічнае становішча правінцыі. Асаблівасці прыроды: геалагічная будова, карысныя выкапні, рэльеф; клімат і гідраграфія; глебава-расліннае покрыва; жывёльны свет. Прыродаахоўныя тэрыторыі.

Заходне-Беларуская і Усходне-Беларуская правінцыі. Геаграфічнае становішча правінцый. Асаблівасці прыроды: геалагічная будова, карысныя выкапні, рэльеф; клімат і гідраграфія; глебава-расліннае покрыва; жывёльны свет. Прыродаахоўныя тэрыторыі.

Перадпалеская і Палеская правінцыі. Геаграфічнае становішча правінцый. Асаблівасці прыроды: геалагічная будова, карысныя выкапні, рэльеф; клімат і гідраграфія; глебава-расліннае покрыва; жывёльны свет. Прыродаахоўныя тэрыторыі.

Практычная работа

4*[2]. Фізіка-геаграфічная характарыстыка сваёй мясцовасці.

---

[2]Выніковыя практычныя работы, пазначаныя знакам «*», могуць быць выкананы ў рамках тэматычнага

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення пра: прыроднае раяніраванне і яго віды, асноўныя адзінкі фізіка-геаграфічнага раяніравання;

асноўныя паняцці: фізіка-геаграфічнае раяніраванне, правінцыя, акруга, фізіка-геаграфічны раён;

умеюць:

паказваць на карце правінцыі – Беларускую Паазерскую, Заходне-Беларускую, Усходне-Беларускую, Перадпалескую, Палескую;

характарызаваць асаблівасці прыроды фізіка-геаграфічных правінцый па тыпавым плане;

тлумачыць сутнасць прыроднага раяніравання;

працаваць з рознымі крыніцамі геаграфічнай інфармацыі для фізіка-геаграфічнай характарыстыкі сваёй мясцовасці.

## Тэма 5. Геаграфія насельніцтва (4 гадзіны)

Колькасць і размяшчэнне насельніцтва Рэспублікі Беларусь. Нараджальнасць, смяротнасць і натуральны рух насельніцтва. Шчыльнасць насельніцтва. Фактары, якія ўплываюць на размяшчэнне насельніцтва Беларусі.

Структура насельніцтва Беларусі згодна з полам і ўзростам. Працоўныя рэсурсы Беларусі.

Унутраная і знешняя міграцыя насельніцтва краіны. Этнічны і рэлігійны склад насельніцтва.

Гарадское і сельскае насельніцтва краіны. Найбуйнейшыя гарады. Гарады-спадарожнікі. Сельскае рассяленне. Аграгарадкі.

Практычная работа

5. Пабудова і аналіз полаўзроставай піраміды насельніцтва Беларусі.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення пра: дэмаграфічныя працэсы ў Беларусі; структуру насельніцтва згодна з полам і ўзростам; тыпы рассялення, горад-спадарожнік;

---

кантролю.

асноўныя паняцці: дэпапуляцыя, эканамічна актыўнае насельніцтва, аграгарадок;

умеюць:

паказваць на карце самыя вялікія па колькасці насельніцтва гарады Беларусі – Брэст, Баранавічы, Пінск, Віцебск, Наваполацк, Полацк, Гомель, Мазыр, Гродна, Ліду, Магілёў, Бабруйск, Мінск, Барысаў, Салігорск, Маладзечна, Жодзіна; Мінскую агламерацыю;

характарызаваць асаблівасці размяшчэння насельніцтва, натуральнага руху і міграцыі насельніцтва, полаўзроставую структуру, тыпы рассялення;

разлічваць па статыстычных даных сярэднюю шчыльнасць насельніцтва адміністрацыйнага раёна;

працаваць са статыстычнымі данымі для пабудовы полаўзроставай пірамiды насельніцтва Беларусі.

## Тэма 6. Геаграфія гаспадаркі і знешнеэканамічныя сувязі Беларусі (18 гадзін)

Нацыянальная эканоміка Беларусі. Дынаміка ВУП. Сучасная структура эканомікі Беларусі.Структура сферы вытворчасці. Структура прамысловасці. Структура сферы паслуг. Фактары, якія абумоўліваюць размяшчэнне вытворчасці.

Геаграфія сельскай гаспадаркі. Роля сельскай гаспадаркі ў эканоміцы краіны. Структура і размяшчэнне зямельных угоддзяў. Геаграфія раслінаводства (збожжавая гаспадарка, бульбаводства, агародніцтва, садоўніцтва, вырошчванне тэхнічных культур).

Геаграфія жывёлагадоўлі.

Геаграфія лясной гаспадаркі. Структура і роля лясной гаспадаркі ў эканоміцы краіны. Геаграфія лесанарыхтовак. Геаграфія найбуйнейшых паляўнічых угоддзяў краіны. Геаграфія рыбалоўства і рыбаводства.

Геаграфія прамысловасці. Горназдабыўная прамысловасць, яе склад, роля ў структуры гаспадаркі. Здабыча нафты і спадарожнага газу, торфу. Геаграфія здабычы карысных выкапняў для хімічнай прамысловасці. Здабыча каменнай солі. Здабыча карысных выкапняў для вытворчасці будаўнічых матэрыялаў.

Электраэнергетыка. Геаграфія вытворчасці і фактары размяшчэння. Цеплавыя і гідраўлічныя электрастанцыі краіны. Альтэрнатыўныя крыніцы электраэнергіі і перспектывы іх выкарыстання. Развіццё атамнай электраэнергетыкі.

Нафтаперапрацоўчая, газаперапрацоўчая прамысловасць. Фактары размяшчэння вытворчасці нафтапрадуктаў. Найбуйнейшыя нафтаправоды і цэнтры нафтаперапрацоўкі.

Металургія. Структура, фактары размяшчэння і геаграфія металургічнай вытворчасці. Геаграфія вытворчасці гатовых металічных вырабаў.

Машынабудаванне. Структура, фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці машын, абсталявання, транспартных сродкаў і абсталявання, прыборабудавання.

Хімічная прамысловасць. Структура, сыравінная база, фактары размяшчэння. Вытворчасць хімічных прадуктаў, гумавых і пластмасавых вырабаў, фармацэўтычнай прадукцыі.

Вытворчасць будаўнічых матэрыялаў. Фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці шкла і вырабаў са шкла, керамічных вырабаў, цэглы, чарапіцы, цэменту, вапны, гіпсу, вырабаў з бетону, нярудных будаўнічых матэрыялаў.

Дрэваапрацоўчая прамысловасць, мэблевая і цэлюлозна-папяровая прамысловасць. Структура і фактары размяшчэння. Геаграфія вытворчасці.

Лёгкая прамысловасць. Структура, фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці тканін, адзення, трыкатажных і панчошна-шкарпэткавых вырабаў. Сыравінная база і фактары размяшчэння вытворчасці скуры, вырабаў са скуры, абутку. Найбуйнейшыя цэнтры скуранай і абутковай вытворчасці.

Харчовая прамысловасць. Структура, фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці мяса і мясапрадуктаў, малочных прадуктаў, рыбы і рыбных прадуктаў, алеяў і тлушчаў, прадуктаў мукамольна-крупяной прамысловасці, цукру.

Сфера паслуг, яе структура і роля ў эканоміцы. Геаграфія гандлю, інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, фінансавай дзейнасці.

Геаграфія адукацыі, аховы здароўя, турызму і іншых відаў дзейнасці ў сферы паслуг.

Геаграфія транспарту. Асаблівасці, характэрныя рысы развіцця і геаграфія асноўных відаў транспарту Беларусі. Галоўныя транспартныя магістралі краіны.

Знешнеэканамічныя сувязі Беларусі. Месца краіны ў міжнародным падзеле працы. Геаграфія знешняга гандлю. Галоўныя эканамічныя партнёры Беларусі. Знешнегандлёвы баланс краіны. Замежныя інвестыцыі. Свабодныя эканамічныя зоны, сумесныя і замежныя арганізацыі на тэрыторыі Беларусі.

Практычныя работы

6*. Пабудова і аналіз картасхемы «Фактары размяшчэння і геаграфія прамысловай вытворчасці» (адной з галін прамысловасці на выбар).

7. Нанясенне на контурную карту і аналіз размяшчэння: а) свабодных эканамічных зон; б) транс’еўрапейскіх транспартных камунікацый (чыгунка, шаша, нафта- і газаправоды, лініі электраперадачы).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення пра: асноўныя фактары размяшчэння вытворчасці; галіны гаспадаркі і віды эканамічнай дзейнасці; галіновую і тэрытарыяльную структуру гаспадаркі Беларусі; структуру галін прамысловасці; геаграфію вытворчасці асноўных відаў прамысловай прадукцыі; структуру і геаграфію вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі; асаблівасці развіцця і фактары размяшчэння асобных галін сферы паслуг; лагістычныя цэнтры; галоўных эканамічных партнёраў Беларусі; знешнегандлёвы баланс краіны; свабодныя эканамічныя зоны; сумеснае прадпрыемства;

асноўныя паняцці: галіновая структура гаспадаркі, транспартная сетка, транспартны вузел, знешнегандлёвы баланс, інвестыцыя, свабодная эканамічная зона;

умеюць:

паказваць на карце найбуйнейшыя прамысловыя цэнтры; гарады, якія з’яўляюцца абласнымі цэнтрамі, найбуйнымі транспартнымі вузламі, а таксама гарады, у якіх знаходзяцца ўстановы вышэйшай адукацыі (універсітэты, акадэміі, інстытуты), лагістычныя цэнтры; свабодныя эканамічныя зоны Беларусі – «Мінск», «Гомель-Ратон», «Віцебск», «Магілёў», «Гроднаінвест», «Брэст»;

тлумачыць прычыны ўзнікнення праблем развіцця і размяшчэння прадпрыемстваў сферы вытворчасці, а таксама адрозненняў ва ўзроўні развіцця сферы паслуг; паказчыкі і асаблівасці развіцця і размяшчэння найважнейшых відаў эканамічнай дзейнасці сферы паслуг;

характарызаваць асноўныя праблемы і напрамкі развіцця гаспадаркі; структуру сельскагаспадарчых угоддзяў; размяшчэнне вытворчасці на тэрыторыі краіны; асобныя віды эканамічнай дзейнасці сферы паслуг; геаграфічную структуру знешняга гандлю краіны;

працаваць з контурнай картай: наносіць свабодныя эканамічныя зоны і транс’еўрапейскія транспартныя камунікацыі.

### Тэма 7. Вобласці і горад Мінск (7 гадзін)

Брэсцкая вобласць. Прыродныя рэсурсы. Насельніцтва і яго нацыянальны склад. Структура прамысловасці і сельскай гаспадаркі,

асаблівасці іх размяшчэння. Спецыялізацыя гаспадаркі. Найбуйнейшыя прамысловыя і культурныя цэнтры.

Віцебская вобласць. Прыродныя рэсурсы. Насельніцтва і яго рассяленне. Структура прамысловасці і сельскай гаспадаркі, асаблівасці іх размяшчэння. Спецыялізацыя гаспадаркі. Рэкрэацыйны патэнцыял вобласці. Найбуйнейшыя прамысловыя і культурныя цэнтры.

Гомельская вобласць. Размяшчэнне тэрыторыі ў межах Палескай нізіны і асаблівасці прыроды. Мінеральныя і лясныя рэсурсы. Насельніцтва і асаблівасці рассялення. Структура прамысловасці і сельскай гаспадаркі, асаблівасці іх размяшчэння. Спецыялізацыя гаспадаркі. Найбуйнейшыя прамысловыя і культурныя цэнтры.

Гродзенская вобласць. Прыродныя рэсурсы. Насельніцтва і яго нацыянальны склад. Структура прамысловасці і сельскай гаспадаркі, асаблівасці іх размяшчэння. Спецыялізацыя гаспадаркі. Развіццё атамнай энергетыкі. Найбуйнейшыя прамысловыя і культурныя цэнтры.

Мінская вобласць. Прыродныя рэсурсы. Насельніцтва і асаблівасці яго рассялення. Структура прамысловасці і сельскай гаспадаркі, асаблівасці іх размяшчэння. Спецыялізацыя гаспадаркі. Найбуйнейшыя прамысловыя і культурныя цэнтры.

Мінск – сталіца Беларусі. Эканоміка-геаграфічнае становішча. Спецыялізацыя гаспадаркі. Найбуйнейшыя прамысловыя прадпрыемствы. Фарміраванне і праблемы развіцця Мінскай агламерацыі.

Магілёўская вобласць. Прыродныя рэсурсы. Насельніцтва і яго рассяленне. Структура прамысловасці і сельскай гаспадаркі, асаблівасці іх размяшчэння. Спецыялізацыя гаспадаркі. Найбуйнейшыя прамысловыя і культурныя цэнтры.

Практычная работа

8*. Характарыстыка свайго адміністрацыйнага раёна / населенага пункта (выконваецца на ўроку вывучэння сваёй вобласці).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні:

ведаюць:

на ўзроўні ўяўлення пра: адметныя асаблівасці комплекснай геаграфічнай характарыстыкі кожнай вобласці і горада Мінска;

умеюць:

паказваць на карце галоўныя геаграфічныя аб’екты абласцей; гарады – Оршу, Ліду;

вызначаць спецыялізацыю гаспадаркі;

апісваць адметныя і ўнікальныя аб'екты;

характарызаваць вобласці па асноўнай схеме, свой раён (горад) згодна з планам;

прагназаваць сацыяльна-эканамічнае развіццё вобласці;

працаваць з рознымі крыніцамі геаграфічнай інфармацыі для характарыстыкі свайго адміністрацыйнага раёна (населенага пункта).